УДК 947.6(=411.6) «1914/1916»

# ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА Ў ЛІЧБАХ І ФАКТАХ

***М.В. ЦУБА***
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** У гэтым годзе спаўняюцца 100-я ўгодкі з пачатку Першай сусветнай вайны (1 жніўня 1914). Паводле маштабаў, разбурэнняў і ахвяр Першая сусветная вайна далёка апярэдзіла ўсе папярэднія войны. У яе было ўцягнута 38 краін з насельніцтвам звыш 1,5 млрд чалавек, гэта значыць на той час 75% усяго насельніцтва зямнога шара. Амаль усё насельніцтва на беларускіх землях тым ці іншым чынам была закранута дадзенай вайной.

Вывучэнне, пераправерка, параўнанне шматлікіх дадзеных статыстыкі, лічбаў, фактаў падзей акрэсленай вайны з'яўляецца адной з актуальных праблем і ў наш час. Абумоўлена гэта ўзрастаючым інтарэсам беларусаў да пазнання гісторыі свайго краю, асабліва такога лёсавызначальнага перыяду, як Першая сусветная вайна.

Аднак па-ранейшаму шматлікія пытанні гісторыі Першай сусветнай вайны яшчэ не вывучаны, многія лічбы і факты застаюцца невядомымі. Растлумачыць гэта можна шэрагам прычын.

Па-першае, «імперыялістычная вайна», як яе назвалі падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, была перакрэслена гэтай рэвалюцыяй, а затым перарасла ў «грамадзянскую» і як бы перастала існаваць у сувязі з зменай палітычнай улады і духоўных каштоўнасцяў.

Па-другое, у савецкай гісторыяграфіі бытавала меркаванне, што ўсё тое, што адбывалася да Кастрычніцкай рэвалюцыі, было непажаданым, непапулярным, не лічылася вартым увагі, бо звязвалася з царызмам.

Па-трэцяе, доўгія гады асноўныя сілы даследчыкаў ваеннай гісторыі былі накіраваны на вывучэнне падзей перыяду Другой сусветнай вайны.

**Асноўная частка**. Для вядзення ваенных дзеянняў краінамі-удзельніцамі Першай сусветнай вайны было мабілізавана амаль 73,5 млн чалавек.

За гады Першай сусветнай вайны Расійская імперыя мабілізавала самую вялікую армію з ўсіх ваюючых краін – 19 млн чалавек, але гэта складала 8,7% усяго насельніцтва краіны, у той час як у Англіі было мабілізавана 10,7% ад насельніцтва краіны (без калоній), у Францыі – 17%, а ў Германіі – 20%.

Пры чым непасрэдна з Расіі (маецца на ўвазе яе сучасная тэрыторыя) ваеннаабавязаннымі сталі звыш 15 млн чалавек. Астатнія 4 млн ваеннаабавязанных прыходзяцца на іншыя рэгіёны, уваходзіўшыя ў склад Расійскай імперыі.

**Колькасць ваеннаабавязаных за ўвесь час вайны (у млн. чал.)** [6, с. 286]






Полесгу




Колькасць мабілізаваных у Расійскай імперыі непасрэдна пад ружжо для вядзення ваенных дзеянняў складала звыш 6 млн чалавек. Яшчэ 13 млн чалавек з’яўляліся тымі ваеннаабавязанымі, якія прыцягваліся да выканання розных работ для ваенных патрэб і ўмацавання тылу.

У 1914-1915 гадах на беларускіх землях адбываецца мабілізацыя працаздольных мужчын ад 18 да 40 гадоў у дзеючую армію, згодна з указам урадавага Сената аб прызыве на ваенную службу ніжніх чыноў запаса арміі і флота [1].

Што датычыцца падліку мабілізаваных на беларускіх землях, то тут неабходна вызначыцца з тэрыторыяй. Напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны пад тэрыторыяй з назвай «Беларусь» патрэбна разумець пяць беларускіх губерняў: Віленскую (акрамя сучасных беларускіх земляў, што ў яе ўваходзілі, прыплюсоўваем сюды, усходнія, сённешнія летувіскія паветы з Вільняй), а таксама Гродзенскую, Мінскую, Віцебскую і Магілеўскую ў тых памерах, у якіх яны ў той час існавалі. Агульная плошча беларускіх губерняў складала 242700 кв. км. Згодна з перапісам насельніцтва Расійскай імперыі у 1897 г., тут пражывала 8518247 чалавек, у тым ліку 5408420 беларусаў, 1202129 яўрэяў, 492921 расіян, 424236 палякаў, 377487 украінцаў і інш. нацыянальнасцяў. У 1914 г. насельніцтва на дадзенай тэрыторыі перавышала 9 млн чалавек, амаль 70% жыхароў з’яўляліся беларусамі.

Царскія ўлады ў мэтах ачысткі прыфрантавой паласы ад «неблаганадзейных элементаў», а таксама на выпадак свайго адступлення, каб пазбавіць ворага жывой рабочай сілы, падвяргалі найбольш масавай мабілізацыі менавіта беларускія губерні. Толькі з Мінскай, Віцебскай і Магілеўскай губерняў было мабілізавана і накіравана на фронт 634,4 тысяч чалавек. Яшчэ не меней 270 тысяч паспелі мабілізаваць з Гродзенскай і Віленскай губерняў. Калі ў цэлым па 50-ці губернях Расіі на працягу вайны было мабілізавана 47,4% працаздольных мужчын, то ў Магілеўскай губерні – 50,7%, Віцебскай – 52,2% [2, с 49]. Што ж датычыцца заходніх раёнаў Беларусі, якія затым аказаліся пад нямецкай акупацыяй, то там «праводзілася амаль пагалоўная мабілізацыя мужчынскага насельніцтва» [3, с. 213].

Такім чынам, лічба мабілізаваных на беларускіх землях непасрэдна ў дзеючую армію перавышае 900 тыс. чалавек. Нават, калі падлічыць мабілізаваных пад ружжо (у межах сучаснай тэрыторыі Беларусі), то і тут будзе звыш 800 тыс. чалавек.

Яшчэ большая колькасць беларускага насельніцтва стала ваеннаабавязанымі і прыцягвалася да выканання ваенных работ. Па абавязковай пастанове ў жніўні 1916 г. начальніка Мінскай ваеннай акругі «сяляне прыфрантавых паветаў, а таксама бежанцы і іншыя асобы абоега пола ад 15 да 50 гадоў павінны прыцягвацца да работ, звязанымі з праблемамі арміі» [4].

У выніку летам 1916 г. у Мінскай губерні на ваенных работах было зарэгістрыравана 219300 мужчын і жанчын, у Віцебскай – 121200 пешых і 44000 на фурманках. Па сутнасці да гэтых работ прыцягвалася ўсё мясцовае насельніцтва [5, с. 606-607]. Нават па самых сціплых падліках колькасць ваеннаабавязаных, працуючых на ваенных работах у Беларусі на працягу вайны, пераважае 1 млн чалавек. Адсюль і вынікае, згодна з табліцай, 1 млн 900 тыс. мабілізаваных пад ружжо і ваеннаабавязаных. І гэта толькі на падкантрольнай расійскім войскам тэрыторыі.

У сваю чаргу на акупіраванай германскімі войскамі беларускай тэрыторыі (50 тыс. кв. км.) пражывала 1,5 млн чалавек. Не меней 80 тыс. з іх таксама былі задзейнічаны на прымусовых ваенных работах ужо кайзераўскімі войскамі. Аднак ваеннаабавязанымі іх не лічылі.

Агульныя страты ўсёй расійскай арміі (напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года) склалі 35% ад ліку мабілізаваных, у Велікабрытаніі – 42%, у Францыі - 47%, у Германіі – 55%.

ПолесГУ

Табліца 1 – Страты ў Першай сусветнай вайне [6, с. 285]

| Краіны | Забіта, памерла ад ран, а таксама ад розных хвароб і эпідэмій падчас бежанскіх скітанняў | Паранена | Палонныя або прапаўшыя без вестак |
|---|---|---|---|
| Краіны Антанты і дзяржавы якія да іх далучыліся | | | |
| Расія,<br>з гэтага ліку на беларускіх землях | 1 700 000<br>550 000 | 4 950 000<br>450 000 | 2 500 000<br>450 000 |
| Брытанская імперыя | 908 371 | 2 090 212 | 191 652 |
| Францыя | 1 357 800 | 4 266 000 | 537 000 |
| Італія | 650 000 | 947 000 | 600 000 |
| Злучаныя Штаты Амерыкі | 116 516 | 204 002 | 4 500 |
| Японія | 300 | 907 | 3 |
| Румынія | 335 706 | 120 000 | 80 000 |
| Сербія | 45 000 | 133 148 | 152 958 |
| Бельгія | 13 716 | 44 686 | 34 659 |
| Грэцыя | 5 000 | 21 000 | 1 000 |
| Партугалія | 7 222 | 13 751 | 12 318 |
| Чарнагорыя | 3 000 | 10 000 | 7 000 |
| **Усяго** | **5 142 631** | **12 800 706** | **4 121 090** |
| Краіны германскай кааліцыі | | | |
| Германія | 1 733 700 | 4 216 058 | 1 152 800 |
| Аўстра-Венгрыя | 1 200 000 | 3 623 000 | 2 200 000 |
| Турцыя | 325 000 | 400 000 | 250 000 |
| Балгарыя | 87 500 | 152 390 | 27 029 |
| **Усяго** | **3 386 200** | **8 388 448** | **3 629 829** |
| **Агульная колькасць** | **8 528 831** | **21 189 154** | **7 750 919** |

Такім чынам, страты ў пяці беларускіх губернях мелі наступныя вынікі: непасрэдна забіта на фронце, памерла ад ран і ў палоне (у немецка-аўстрыйскім палоне памерла не меней 30 тысяч беларусаў), а таксама загінула ваеннаабавязаных падчас няшчасных выпадкаў на розных ваенных работах звыш 300 тысяч чалавек. Яшчэ каля 250 тысяч мірных жыхароў з беларускіх земляў загінулі ад выкліканых вайной абставін. І гэта не лічачы тых, хто памёр звычайнай смерцю ( за гады вайны, прыкладна 160 тысяч чалавек).

Што датычыцца параненых, то маюцца на ўвазе не толькі параненыя на фронце, але і тыя ваеннаабавязаныя, а таксама мірнае насельніцтва, якія звярталіся за дапамогай у сувязі з раненнямі, атрутай ад газаў, істотнымі траўмамі і г. д., атрыманымі ў выніку ваенных дзеянняў, альбо ад умоў, звязанных з ваенным становішчам.

У катыгорыю палонныя і прапаўшыя без вестак аднесены не толькі ваеннапалонныя і прапаўшыя без звестак на фронце, але таксама і тыя хто быў забраны на работы ў Германію і адтуль не вярнуўся, хто прапаў без вестак на работах сярод ваеннаабавязаных і вялікая колькасць прапаўшых без вестак беларусаў у ходзе бежанскіх скітанняў.

Істотныя страты для расійскай арміі былі звязаны з дызерцірствам. Калі з пачатку вайны і да Лютаўскай рэвалюцыі агульная колькасць дызерціраў склала 195 тысяч чалавек, то за пяць месяцаў, прайшоўшых пасля гэтай рэвалюцыі, з арміі дызерціравала звыш 150 тысяч чалавек. Калі да Лютаўскай рэвалюцыі расійскую армію ў сярэднім за месяц астаўляла 6 тысяч 300 салдат, то пасля рэвалюцыіу пяць разоў болей – 30 тысяч 900 [7, с. 65].

У сувязі з навукова-тэхнічным прагрэсам, які прывёў да стварэння зброі масавага паражэння, часцей ужо не храбрасць салдат, а агнявая магутнасць вырашала зыход той ці іншай бітвы.



ПолесГУ

**Баявыя сродкі асноўных ўдзельнікаў вайны** [6, с. 284]




Вытворчасць зброі, асабліва новых відаў узбраенняў, дасягнула неверагодных памераў. Прымяненне танкаў, самалётаў, падводных лодак, артылерыі, кулямётаў, удушлівых газаў значна пашырала маштабы ваенных дзеянняў, істотна павялічыла колькасць забітых і параненых. Баявыя сродкі асноўных удзельнікаў вайны моцна паўплывалі не толькі на лёсы салдатаў, але і на велізарную колькасць мірнага насельніцтва, якое аказалася ў эпіцэнтры ваенных дзеянняў. І гэта ў першую чаргу датычыцца беларускага насельніцтва, так як з 1915 па 1918 гг. менавіта на беларускіх землях праходзіла лінія фронту. Мірнае беларускае насельніцтва гінула не толькі ад снарадаў, куль, газаў, але і ад выкліканых умовамі вайны розных хвароб, эпідэмій, бежанскіх скітанняў, холаду, голаду, разрухі, пажараў, рабаўніцтва, непамерных рэквізіцый, гвалту, псіхалагічных патрасенняў і г. д.

Такім чынам, вайна загубіла мільёны людзей, прычыніла шматлікія матэрыяльныя страты, выдаткавала шматмільённыя сродкі  на ваенныя патрэбы. Яна паглынула ў сярэднім 1/3 нацыянальнага багацця асноўных ваяваўшых краін. Цэлыя гарады і паселішчы былі змецены з твару зямлі, разбурана вялікая колькасць чыгунак, мастоў, заводаў і фабрык. Вайна прывяла да развалу прамысловасці, сельскай гаспадаркі і фінансаў амаль усіх еўрапейскіх дзяржаў.

Тым самым Першая сусветная вайна значна аслабіла становішча еўрапейскіх краін на сусветнай арэне. Асноўным цэнтрам палітычнай сілы ў свеце становяцца Злучаныя Штаты Амерыкі.

Табліца 2 –Кошт вайны (усе ваенныя выдаткі і страты) 1914-1918 гг. [6, с. 285]

| Краіны | Агульная сума, у млн. долараў | На душу насельніцтва, ў доларах | У % да багаццяў краіны |
|---|---|---|---|
| Расія | 7 658 | 127,5 | 23,2 |
| Англія | 24 143 | 524,9 | 34,5 |
| Францыя | 11 208 | 280,2 | 19,4 |
| Італія | 4 489 | 124,6 | 20,6 |
| ЗША | 17 337 | 176,9 | 8,8 |
| Германія | 19 894 | 292,6 | 24,7 |
| Аўстра-Венгрыя | 5 438 | 108,8 | 18,1 |

Падчас Першай сусветнай вайны ў вайсковых фарміраваннях розных краін прыкладна 70% салдат складала пяхота, 15% – артылерыя, 8% – кавалерыя, астатнія 7% прыпадаюць на авіяцыю, сувязь, інжынерныя і аўтамабільныя войскі.

Усяго было ў расійскіх войсках 39 палкоў з беларускімі найменнямі.

Полесгу

Германская пяхотная дывізія на 27% колькасна была меньшай за расійскую пяхотную дэвізію, так як расійскі полк меў у сваім складзе чатыры батальёны, а нямецкі тры. Аднак па агнявой магутнасці нямецкая дывізія пераўзыходзіла расійскую на 50% (на ўзбраенні нямецкай дывізіі меліся 24 кулямёты і 72 гарматы, з іх 12 цяжкіх).

У гады вайны было сфарміравана 50 партызанскіх атрадаў колькасцю ад 65 да 200 чалавек у кожным. Акрамя таго па асабістай ініцыятыве ваеннага расійскага кіраўніцтва ствараліся і дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі групы «паляўнічых».

З ўвесь час вайны праз службу ў расійскай арміі прайшло звыш 5 тысяч праваслаўных святароў. 30 з іх былі забітыя ў ходзе ваенных дзеянняў, звыш за 400 атрымалі раненні, болей 100 папалі у палон.

Непасрэдны ўдзел у ваенных дзеяннях прымалі і жанчыны. Напрыклад, у расійскіх вайсковых фарміраваннях ваявалі два жаночых «батальёны смерці» і яшчэ некалькі жаночых рот. У склад гэтых фарміраванняў уваходзіла звыш 3 тысяч жанчын. Таксама на фронце знаходзіліся і тысячы міласэрных сёстраў. Найбольш славутыя з гэтых жанчын – Марыя Бачкарова і Рыма Іванова – ваявалі на беларускай зямлі. Вядома, што і знакамітая беларуская паэтэса Алаіза Пашкевіч (Цётка), працуючы міласэрнай сястрой, спраўна выконвала не толькі свае медыцынскія абавязкі, але і не забывала ў шпіталі падкладваць пад падушкі параненым беларусам газету «Наша Ніва».

Восенню 1914 года ў Германіі, у лабараторыях Хабера, распачалася распрацоўка хімічнай зброі. Пасля вайны ніхто не патрабаваў выдачы Хабера як ваеннага злачынца. Больш таго, напрыканцы 1918 года Нобелеўскі камітэт прысудзіў Хаберу прэмію за каталітычны метад сінтэза аміяка з атмасфернага азота і вадарода. 22 красавіка 1915 года ў раёне Іпра германскія войскі ўпершыню прымянілі газабалонную хімічную атаку. У выніку было атраўлена 20 тысяч салдат, 5 тысяч з іх памерлі. 31 мая 1915 года падобная атака была паўторана на расійска-германскім фронце. Страты расійскай арміі склалі звыш 9 тысяч чалавек. А ў чэрвені 1915 года вучоны Мікалай Зялінскі прадэманстраваў для іспыту першы працівагаз. За ўсе гады Першай сусветнай вайны ў дзеючую армію было накіравана болей 11 мільёнаў працівагазаў, што спасло жыццё мільёнам расійскіх салдат і мірнаму насельніцтву.

Такім чынам, Першая сусветная вайна, якая распачалася з аднаго выстралу ў Сараева, завяршылася масавым кравапраліццем. Яна ж з'явілася своеасаблівым каталізатарам індустрыяльнага развіцця. За гады вайны было выраблена 28 мільёнаў вінтовак, каля 1 мільёна кулямётаў, 150 тысяч гармат, 900 танкаў, тысячы самалётаў, створаны падводны флот.

**Заключэнне**. І ўсё ж Першая сусветная вайна карэнным чынам змяніла грамадска-тэрытарыяльнае аблічча Еўропы. Распаліся Аўстра-Венгерская, Асманская, Расійская і Германская імперыі. У Еўропе ўтварылася мноства дзяржаў (Аўстрыя, Венгрыя, Югаславія, Польшча, Чэхаславакія, Літва, Латвія, Эстонія, Фінляндыя), народы якіх дамагліся сваёй незалежнасці. Менавіта гэтыя народы служылі яскравым прыкладам для беларусаў, так як зацягнуўшаяся вайна, паражэнні на фронце, гаспадарчая разруха, палітычны крызіс у верхах улады наглядна сведчылі аб нездольнасці самадзяржаўя палепшыць становішча. У выніку бедствы вайны аказалі велізарнае рэвалюцыянізіраванае ўздзеянне на ўсе грамадскія слаі беларускага насельніцтва. У беларускім грамадстве падчас Першай сусветнай вайны з'явіліся тыя свядомыя нацыянальныя сілы, якія пры спрыяльных варунках маглі прывесці да беларускай дзяржаўнасці.

У цэлым жа Першая сусветная вайна не столькі вырашыла, сколькі абвастрыла супярэчнасці паміж вялікімі дзяржавамі свету, што з цягам часу прывяло чалавецтва да новай, яшчэ больш страшнай і разбуральнай – Другой сусветнай вайны.

## ЛІТАРАТУРА


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ).– Ф. 1416.– Воп. 1.– Спр. 2355.– Л. 2.
2. Россия в мировой войне 1914-1918 гг. (в цифрах).– М.: Центр. Стат. Управление, 1925. – 103 с.
3. Липинский, Л.П. Крестьянское движение в Белорусии в период между двумя революциями (июнь 1907- февраль 1917 гг.) / Л.П. Липинский, Е.П. Лукьянов. – Минск : Наука и техника, 1964. – 260 с.
4. НАРБ. – Ф. 705. – Воп. 1. – Спр. 27. –Л. 109.
5. Гісторыя Беларускай ССР у пяці тамах. Т. 2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861-1917 гг.). – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 688 с.
6. Цуба, М.В. Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі) 1914 – 1918 гг.: Манаграфія / М.В. Цуба. – Пінск : ПалесДУ, 2010. – 304 с.




Полесгу

7. Образцов, И. Сила и дух / И. Образцов // Родина, Российский историко-публицистический журнал. – 1993. – № 8,9.

## WORLD WAR I IN DATES AND EVENTS

***M.V. TSUBA***

***Summary***

This article runs about fundamental dates and events of World War I.

Special attention is paid to the scientific introduction of the dates and events of World War I directly related to the territory of Belarus.

© Цуба М.В.

*Поступила в редакцию 25 сентября 2014г.*

ПолесГУ